# Учора ў Маскве адкрыўся XXII з'езд КПСС

*САМЫ ЗВЫЧАЙНЫ ДЗЕНЬ БЫЎ УЧОРА, 17 КАСТРЫЧНІКА. І Ў ТОЙ ЖА ЧАС ГЭТА ТАКІ НЕЗВЫЧАЙНЫ ДЗЕНЬ! ЁН НАЗАЎСЁДЫ ЎВОЙДЗЕ Ў ГІСТОРЫЮ НАШАЙ КРАІНЫ. УЧОРА Ў СЭРЦЫ НАШАЙ РАДЗІМЫ—МАСКВЕ—АДКРЫЎСЯ XXII З'ЕЗД КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА. ЛЕПШЫЯ СЫНЫ І ДОЧКІ НАРОДА, ДЭЛЕГАТЫ ПАРТЫЙНАГА З'ЕЗДА ПРЫМУЦЬ НОВУЮ ПРАГРАМУ, ПРАГРАМУ КАМУНІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА. НАМ, МАЛАДЫМ, БУДАВАЦЬ КАМУНІЗМ, НАМ ЖЫЦЬ ПРЫ КАМУНІЗМЕ. УЖО СЁННЯ МЫ ПАВІННЫ ВЫХОЎВАЦЬ У САБЕ ЯКАСЦІ ЧАЛАВЕКА СВЕТЛАЙ КАМУНІСТЫЧНАЙ БУДУЧЫНІ.*

*НАША ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА — У СЛОВАХ ДАРАГОГА ІЛЬІЧА: ВУЧЫЦЦА, ВУЧЫЦЦА І ЯШЧЭ РАЗ ВУЧЫЦЦА; АВАЛОДВАЦЬ НЕВЫЧАРПАЛЬНАЙ СКАРБНІЦАЙ ЧАЛАВЕЧЫХ ВЕДАЎ І РУХАЦЬ УПЕРАД ПЕРАДАВУЮ САВЕЦКУЮ НАВУКУ. У НАШЫХ МАЛАДЫХ РУКАХ—БУДУЧАЕ ЛЮБІМАЙ КРАІНЫ. ГЭТА ДЛЯ НАС ПРЫМУЦЬ ДЭЛЕГАТЫ ВЯЛІКУЮ ПРАГРАМУ КАМУНІЗМА, МЫ БУДЗЕМ ВЫКОНВАЦЬ ЯЕ.*

*БУДЗЕМ ЖА РЫХТАВАЦЬ СЯБЕ ДА ГЭТАЙ ВЕЛІЧНАЙ І АДКАЗНАЙ СПРАВЫ!*

*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі ўніверсітэт

**Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна**

**№ 29 (460) | Серада, 18 кастрычніка 1961 г. | Цана 1 кап.**



Медалем «За працоўную адзнаку» ўзнагароджан загадчык кафедры беларускай мовы Міхаіл Іванавіч Жыркевіч.

НА ЗДЫМКУ: М. І. Жыркевіч у рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт».
**Фота Л. КУЗЬМІЦКАГА.**

*У камуністаў філалагічнага факультэта*

## Кандыдацкі стаж—школа выхавання

*У новым Статуце Камуністычнай партыі гаворыцца: «Усе асобы, якія ўступаюць у партыю, праходзяць кандыдацкі стаж, неабходны для таго, каб азнаёміцца з Праграмай і Статутам КПСС і падрыхтавацца да ўступлення ў члены партыі. Партыйная арганізацыя павінна дапамагчы кандыдату падрыхтавацца да ўступлення ў члены КПСС і праверыць яго асабістыя якасці.»*

*Якую ж работу праводзіць у гэтым напрамку партарганізацыя філалагічнага факультэта? Такое пытанне паўстала невыпадкова. Справа ў тым, што на факультэт прымаецца значная колькасць маладых камуністаў і кандыдатаў у члены партыі.*

*Гэтай рабоце партбюро факультэта ўдзяляе вялікую ўвагу. Па даручэнню бюро старэйшы член партыі М. С. Зярніцкі вельмі сур'ёзна і ўдумліва падыходзіць да справы выхавання маладых камуністаў. Многа працуюць у гэтым напрамку сакратар бюро В. А. Захарава, члены бюро С. А. Лысенка, М. А. Жыдовіч і іншыя выкладчыкі-камуністы.*

*Значна ўзмацнілася гэтая работа ў дні абмеркавання Праграмы і Статута партыі. Асаблівая ўвага ўдзяляецца пытанням падрыхтоўкі кандыдатаў да паступлення ў члены КПСС. З імі праводзіліся гутаркі, на якіх абмяркоўваліся асноўныя палажэнні Статута, абавязкі і правы членаў партыі, змест работы пярвічных партыйных арганізацый. Праводзіліся індывідуальныя гутаркі з кожным маладым камуністам.*

*Кожнаму, хто рыхтуецца да паступлення ў партыю, дадзена партыйнае даручэнне. Зроблена гэта, каб праверыць іх асабістыя якасці.*

*Так, Яўген Сяліцкі, з'яўляючыся кандыдатам у члены КПСС, выконваў абавязкі намесніка старшыні студсавета. Ён добра зарэкамендаваў сябе на гэтай рабоце і пасля ўступлення ў члены партыі абраны ў партыйнае бюро факультэта.*

*Вялікую прынцыповасць праявіў Адам Капусцін, калі працаваў у мінулым годзе ў складзе студсавета і рэдкалегіі сатырычнай газеты «Пражэктар». У гэтым годзе камуніст абраны старшынёй студсавета.*

*Нядрэнна справіўся з абавязкамі рэдактара газеты «Джала» Іван Сачанка.*

*Выдатна зарэкамендавалі сябе маладыя камуністы і на сельскагаспадарчых работах у калгасе.*

*Зараз бюро намячае правядзенне раду гутарак аб Статуце партыі. Папярэдні вопыт дасць магчымасць зрабіць іх яшчэ больш мэтанакіраванымі і карыснымі.*

**А. СЦЯПАНАЎ.**

## Шчырая размова

**З ПАРТЫЙНАГА СХОДУ ФАКУЛЬТЭТА**

Наступіў кастрычнік — веснік глыбокай восені. У гэтым годзе ён, асабліва прыкметны і непаўторны, пераможна крочыць па краіне. А ўчора, 17 кастрычніка адкрыўся гістарычны XXII з'езд Камуністычнай партыі. Увесь народ жыве ў гэтыя дні хвалюючым пачуццём нечага новага, радаснага. На з'ездзе будуць разгледжаны важнейшыя пытанні сучаснасці, прыняты новыя Праграма і Статут Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, якія папярэдне былі шырока абмеркаваны ўсім савецкім народам і адобраны.

Напярэдадні XXII з'езда КПСС адбыўся чарговы з'езд Камуністычнай партыі Беларусі.

Вынікам работы XXV з'езда КПБ быў прысвечаны партыйны сход філалагічнага факультэта, які адбыўся 12 кастрычніка. З дакладам «Задачы партыйнай арганізацыі філфака ў сучасны момант і вынікі XXV з'езда КПБ» выступіў дэлегат з'езда прафесар В. І. Сцяпанаў.

Дакладчык падрабязна расказаў аб выніках з'езда, аб поспехах працаўнікоў рэспублікі ў трэцім годзе сямігодкі, аб тых грандыёзных задачах, якія стаяць цяпер перад нашым народам.

Цікавым было выступленне камуніста А. Я. Бірала. Будаўніцтва матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма ў нашай краіне ставіць і перад намі, педагогамі, вялікія і адказныя задачы. Наша мэта — выхаваць людзей камуністычнага грамадства, высокаадукаваных, сумленных. Неабходна, каб кожная гадзіна заняткаў, кожная лекцыя прыносілі карысць. А. Я. Бірала звяртае ўвагу камуністаў на неабходнасць падняцця ўзроўню студэнцкай навуковай работы.

Сакратар партбюро філфака гав. Захарава спыняецца на рабоце партыйных груп на курсах, прапаноўвае лепш вывучаць і індывідуальна падыходзіць да выхавання кожнага студэнта.

Дэкан філфака прафесар Ларчанка прысвяціў сваё выступленне барацьбе з парушальнікамі вучэбнай дысцыпліны.

Дацэнт Д. Я. Фактаровіч заначыў, што ў святле новага праекта Праграмы КПСС трэба перагледзець планы вучэбнай работы. Большую ўвагу трэба звярнуць завочнай і вячэрняй адукацыі. Часцей неабходны гарачыя літаратурныя дыспуты, творчыя гутаркі. Яны павінны насіць не асветніцкі характар, а глыбока ідэйны, выхаваўчы.

Сакратар парткома універсітэта Р. В. Булацкі заклікаў камуністаў змагацца за камуністычныя формы адносін, паводзін у быту. У кожным інтэрнаце трэба падтрымліваць сацыялістычнае спаборніцтва за пакоі камуністычнага быту.

Адкрыты партыйны сход вылiўся ў шчырую размову аб выхаванні педагогаў і журналістаў. Ён прайшоў пад знакам тых велічных задач і ідэй, якія ставіць перад савецкім народам толькі што адкрыўшыйся XXII з'езд КПСС.

**В. КАВАЛЬКОЎ.**

## УНІВЕРСІТЭЦКАЯ ХРОНІКА

**12 кастрычніка 1961 года Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР В. І. Казлоў уручыў ордэны і медалі СССР групе вучоных БДУ, узнагароджаных за вялікія заслугі ў падрыхтоўцы спецыялістаў і развіцці навукі.**

*** (Наш кар.) 12 кастрычніка ў 58-ай аўдыторыі біякорпуса адбыўся мнагалюдны партыйны сход, на якім камуністы адкрыта абмеркавалі надзённыя задачы партыйных арганізацый біялагічнага, геаграфічнага, матэматычнага, хімічнага, фізічнага факультэтаў пасля XXV з'езда Камуністычнай партыі Беларусі.**

**На сходзе, выступіў дэлегат XXV з'езда КПБ, рэктар універсітэта А. Н. Сеўчанка.**

**Добра папрацавалі студэнты філалагічнага і геаграфічнага факультэтаў на суботніку, арганізаваным у гонар XXII з'езда КПСС. У скверы па Чырвонаармейскай вуліцы яны выкапалі шмат ямак для пасадкі маладых дрэўцаў. Асабліва добра працавалі М. Жук, А. Кукевіч, У. Верамейчык і іншыя.**

## Вучоба і грамадская работа?
# ІХ МОЖНА СУМЯСЦІЦЬ!

*Зараз ва універсітэце праходзяць справаздачна-выбарчыя сходы, якія маюць вялікае значэнне ў жыцці нашага універсітэта, нашай камсамольскай арганізацыі. Камсамольцы вылучаюць камсоргамі, членамі камітэта, камсамольскіх бюро лепшых таварышаў, ініцыятыўных і перадавых студэнтаў.*

*Грамадская праца, грамадская нагрузка — гэтыя словы блізкія і зразумелыя ўсім. Мы не здзіўляемся ў апошні час, калі чуем: «грамадскі інструктар па спорту», «грамадскі кантралёр», «грамадскі інспектар»... Велічныя словы праекта Праграмы Камуністычнай партыі гавораць аб тым, што кожны савецкі чалавек павінен прымаць самы актыўны ўдзел у пабудове камуністычнага грамадства. Кожны студэнт, кожны камсамолец павінен таксама як мага больш і паўней развіваць свае здольнасці і ініцыятыву, актыўна ўдзельнічаць у жыцці сваіх факультэтаў, у камсамольскай рабоце.*

*Грамадская нагрузка ні ў якім разе не ўплывае на вучобу студэнтаў, яшчэ больш пашырае кругагляд, дае практычныя навыкі.*

*Ва універсітэце цяжка знайсці студэнта, які б не выконваў тую ці іншую грамадскую работу. Камсамольскія актывісты, прафсаюзныя работнікі, спартсмены-арганізатары, члены рэдкалегій, удзельнікі самадзейнасці — такія грамадскія даручэнні нясуць камсамольцы. І нясуць іх паспяхова. Сярод камсамольскіх актывістаў ёсць нямала студэнтаў, якія і ў вучобе з'яўляюцца прыкладам для астатніх. Так, студэнтка 3 курса хімічнага факультэта Гвідона Шаўчэнка актыўна ўдзельнічае ў арганізацыі мастацкай самадзейнасці, з'яўляецца членам курсавога бюро, нядрэнная спартсменка. І вучыцца яна выдатна.*

*На «выдатна» здала ўсе экзамены студэнтка 5 курса юрыдычнага факультэта Вера Палуніна. Вучобу яна ўмела спалучае з грамадскай працай. У тым, што факультэцкая насценгазета змястоўная і цікавая, нямала яе заслугі. Любіць Вера і спорт, а таму займаецца ў лыжнай секцыі.*

*Пяць год займаўся ва універсітэце Валерый Пракошын. На працягу гэтага часу ён не толькі добра вучыўся, але і быў нястомным членам бюро камітэта камсамола, нават на 5 курсе. Цяпер Валерый займаецца ў аспірантуры.*

*Ларысе Конюшка, напрыклад, па душы прыйшлася работа ў інтэрнацыянальным клубе, дзе яна старшынёю. Працуючы на працягу двух год, яна цікава паставіла работу ў клубе, абагаціла яе.*

*Многа добрых слоў можна было б сказаць і аб студэнтцы 5 курса хімічнага факультэта Жане Булойчык, студэнтцы 5 курса матфака Святлане Рудзяк, пяцікурсніку юрыдычнага факультэта Сашы Валевічу, члену камсамольскага бюро геафака Пятру Рагачу, студэнтцы геаграфічнага факультэта Тамары Ласько, студэнту хімфака Івану Ласкову і аб многіх іншых.*

*Характэрная рыса: усе ўпамянутыя актывісты добра вучацца. Прычым пералік такіх камсамольцаў можна б было прадоўжыць. Шмат юначага запалу, жадання працаваць па-сапраўднаму, нястомнай энергіі ёсць у нашых лепшых камсамольскіх работнікаў. З іх павінны браць прыклад усе камсамольцы.*

*Наперадзе толькі што пачаты новы навучальны год. Шмат грамадскай працы, маладзёжных спраў чакае нас уперадзе.*

*Актыўней уключайцеся, таварышы, у жыццё нашага калектыву. Цікавых і карысных спраў хопіць усім.*

**Ніна ПЕСЕНКА,**
**член бюро камітэта камсамола.**

### УВАГА!

**У нядзелю, 15 кастрычніка, адбыўся агульнаўніверсітэцкі крос, прысвечаны XXII з'[illegible] КПСС.**

**Аб яго выніках чы[illegible] ў наступным нумары газеты.**

